# РАБОЧЫ ВІЗІТ У БІШКЕК

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8-9 снежня здзейсніць рабочы візіт у Кыргызстан. У Бішкеку кіраўнік беларускай дзяржавы прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Парадак дня саміту ЕАЭС — каля двух дзясяткаў пунктаў. Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць развіццё кааперацыйных праектаў у прамысловасці, фарміраванне агульных рынкаў, работу па ўхіленні перашкод і бар'ераў ва ўзаемным гандлі, асноўныя напрамкі міжнароднай дзейнасці на 2023 год і іншыя пытанні.

Чакаецца, што ў час пасяджэння Аляксандр Лукашэнка агучыць прапановы беларускага боку па стратэгічных напрамках развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза, якія датычацца далейшага паглыблення інтэграцыі на прасторы ЕАЭС і забеспячэння ўстойлівасці нацыянальных эканомік.

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ УСЁ САМІ, ГЭТА ПАКАЗВАЕ І ЖЫЦЦЁ»

### У Савеце Рэспублікі прайшла нарада па пытанні функцыянавання ААТ «МотаВелаЗавод»

**Наталля Качанава правяла нараду па пытанні функцыянавання ААТ «МотаВелаЗавод». Як падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, галоўнай тэмай сустрэчы стала лакалізацыя айчыннай тэхнікі:**

— Мы праводзім чарговую рабочую сустрэчу па пытаннях выканання даручэнняў кіраўніка нашай дзяржавы, якія былі дадзены падчас наведвання «МотаВелаЗавода». 9 лістапада мы зноў сустрэліся на прадпрыемстве, абмеркавалі тыя пытанні, якія ўжо вырашаны і што яшчэ неабходна зрабіць, каб выканаць даручэнні Прэзідэнта, — адзначыла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі скіравала ўвагу на тое, што да новага года прадпрыемства павінна прадставіць кірункі, па якім будзе рухацца:

— Мы павінны паказаць, што будзе выпускаць «МотаВелаЗавод», у тым ліку ў частцы лакалізацыі прадукцыі: што выпускалі раней і што новага з'явіцца ў асартыменце прадпрыемства. Калі мы размаўлялі 9 лістапада, я зразумела, што пытанні лакалізацыі ў нас да канца не вырашаны або прапрацаваны недастаткова. Альбо ёсць нейкія перашкоды ў поўнай меры выпускаць камплектуючыя для матацыклаў і веласіпедаў на прадпрыемствах нашай краіны.

Наталля Качанава падкрэсліла, што неабходна прапісаць, які працэнт прадукцыі быў дасягнуты і што прадпрыемства мяркуе зрабіць, каб выпускаць больш сучасны асартымент:

— Прэзідэнт неаднаразова гаварыў аб тым, што мы можам зрабіць усё самі, гэта паказвае і жыццё. Напрыклад, у сістэме аховы здароўя — выпускаць сродкі для абеззаражвання. Усё гэта мы можам зрабіць самі. Але прадпрыемствам, якія працуюць у нашай краіне, трэба больш актыўна ўключацца, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Па выніках нарады генеральны дырэктар ААТ «МотаВелаЗавод» Сяргей Манько адзначыў, што падчас сустрэчы былі абмеркаваны пытанні лакалізацыі айчыннай тэхнікі і імпартных камплектуючых:

— Да канца першага квартала 2023 года пастаўлена мэта лакалізаваць 26 % айчыннага матацыкла «Мінск». Да канца 2023 года матацыкл «Мінск» будзе лакалізаваны да 36 %, але на гэтым наша вытворчасць не спыняецца — мы будзем праводзіць работу па лакалізацыі і мадэрнізацыі.

**Арына КАРПОВІЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю СІМІРСКАГА Валянціна Раманавіча, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

Парламенцкі дзённік

# ЗБАЛАНСАВАНАСЦЬ БЮДЖЭТУ І САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА НАСЕЛЬНІЦТВА

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні прынялі асноўны фінансавы дакумент краіны

**Аднак не толькі на законапраекце «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год» была засяроджана ўвага парламентарыяў. На заканадаўчым узроўні зацверджана павелічэнне працоўных пенсій, гарантавана выплата ўсіх відаў пенсій і дапамог. Куды будуць накіраваны бюджэтныя сродкі і якім чынам павысіцца дабрабыт беларускага народа, расказалі прадстаўнікі дэпутацкага корпуса і іншых дзяржаўных органаў. Удасканаленне заканадаўства чакаецца таксама ў пытаннях супрацьдзеяння карупцыі, абароны правоў працоўных мігрантаў і прафілактыкі злачыннасці.**



Фота БелТА.

### У прыярытэце — сацыяльная скіраванасць

Адразу ў двух чытаннях дэпутаты прынялі праект Закона «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2023 год». Законапраектам вызначаны крыніцы фарміравання даходаў бюджэту фонду, іх аб'ём і кірункі выкарыстання сродкаў, устанаўліваецца парадак выканання бюджэту фонду. Даходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 25 221,6 мільёна рублёў, або 116 % да бюджэту фонду за 2022 год, расходы — у суме 24 685,1 мільёна рублёў, або 116 % да бюджэту фонду за мінулы год.

Як адзначыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ,** сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце для непрацуючага пенсіянера складзе 692 беларускія рублі. «Адпаведна павялічыць пенсіі ў наступным годзе плануецца на 15 %», — звярнула яна ўвагу. Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Юліі МУРЫНАЙ,** бюджэт фонду на 2023 год сфарміраваны з перавышэннем даходаў над расходамі за кошт сродкаў прафесійнага пенсіённага страхавання ў суме 536,5 мільёна беларускіх рублёў. «Гэта дасць магчымасць гарантаваць выплаты ўсіх відаў пенсій і дапамог у запланаваных аб'ёмах», — падкрэсліла дэпутат.

У першым чытанні дэпутацкім корпусам разгледжаны праект Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год». Ключавой задачай развіцця Беларусі ў наступным годзе, згодна з дакументам, будзе з'яўляцца забеспячэнне збалансаванасці і ўстойлівасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама сацыяльная абароненасць насельніцтва і павышэнне на гэтай аснове дабрабыту беларусаў.

Даходы па праекце рэспубліканскага бюджэту на наступны год прадугледжваюцца ў суме 33 362,4 мільёна рублёў і, у параўнанні з ацэнкай паступленняў бягучага года, павялічацца на 24,6 %. Расходы сфарміраваны ў суме 36 536,2 мільёна рублёў, або 109,9 % да чаканага выканання 2022 года.

Як падкрэсліла **член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Святлана АДЗІНЦОВА,** рэспубліканскі бюджэт на 2023 год захоўвае сацыяльную накіраванасць. «На сацыяльную сферу выдаткаваны 117 % да ацэнкі 2022 года, у тым ліку на ахову здароўя — 116 %, на адукацыю — 119 %, на фізічную культуру, спорт, культуру, СМІ — 118 %, сацыяльную палітыку — 116 %, — удакладніла парламентарый. — У сістэме аховы здароўя захоўваецца фінансаванне на аднаго жыхара ў памеры 1118 беларускіх рублёў. 40 % ад агульнага фінансавання пойдзе на аказанне медыцынскай дапамогі ў амбулаторных умовах, у тым ліку на хуткую медыцынскую дапамогу. З рэспубліканскага бюджэту будуць выдзелены сродкі для цэнтралізаванага набыцця аўтамабіляў хуткай дапамогі, школьных аўтобусаў, аўтамабіляў для сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».

### Падаткі — па новых правілах

У першым чытанні адобраны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Дакументам прадугледжаны сістэмныя меры па ўдасканаленні падатковага заканадаўства і дасягнення аптымальнага ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку, не дапускаючы пры гэтым зніжэння аб'ёму бюджэтных даходаў. У прыватнасці, з 2023 года законапраектам прапаноўваецца адмяніць малаэфектыўныя падатковыя льготы, індэксаваць стаўкі зямельнага, экалагічнага падатку, падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах з мэтай адаптацыі іх да працэсаў інфляцыі. Акрамя таго, павялічацца стаўкі падатку на прыбытак для юрыдычных асоб з 18 да 20 % і з 16 да 20 % — падаходнага падатку з даходаў індывідуальных прадпрымальнікаў. Чакаюцца і іншыя навconfigurationўвядзенні.

— У ходзе падрыхтоўкі змяненняў законаў па пытаннях падаткаабкладання была праведзена сур'ёзная работа па аналізе існуючых падатковых ставак, ільгот, якія дзейнічаюць у нас у краіне, — расказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Пётр ВАБІШЧЭВІЧ.** — У выніку аналізу частку льгот, якія неэфектыўна выкарыстоўваюцца, вырашана адмяніць. Улічваючы вопыт пандэмійнага перыяду, для аператараў сотавай рухомай электрасувязі, камерцыйных мікрафінансавых арганізацый, Парка высокіх тэхналогій захавана стаўка падатку на прыбытак у памеры 30 %. Захавана і права мясцовых Саветаў дэпутатаў уводзіць мясцовы збор за перасячэнне транспартнымі сродкамі граніцы.

### Антыкарупцыйныя абмежаванні

Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях барацьбы з карупцыяй», прыняты ў другім чытанні, у прыватнасці, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці супрацьдзеяння карупцыі, аптымізацыю ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і іншых арганізацый у сферы прафілактыкі карупцыі.

Як паведаміла **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ,** законапраект прадугледжваецца ўстанаўленне антыкарупцыйных абмежаванняў для ўсіх блізкіх сваякоў або родзічаў дзяржаўнай службовай асобы. «Устанаўліваецца забарона сумеснай работы мужа і жонкі, блізкіх сваякоў або родзічаў на пэўных пасадах не толькі ў дзяржарганізацыях, але і ў арганізацыях з пераважнай доляй уласнасці дзяржавы, а таксама на выкарыстанне дзяржаўнай службовай асобай у пазаслужбовых інтарэсах любой маёмасці дзяржоргана або арганізацыі, а не толькі атрыманай ім пры выкананні службовых абавязкаў, — удакладніла дэпутат. — Устанаўліваюцца агульныя падставы адказнасці юрыдычнай асобы за ўчыненне карупцыйных дзеянняў ад яе імя або ў яе інтарэсах. Заканадаўча замацоўваюцца абавязкі для кіраўнікоў дзяржоргаеаў і іншых арганізацый па прадухіленні і выяўленні парушэнняў заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй, ліквідацыі наступстваў парушэнняў, прычын і ўмоў, якія ім садзейнічаюць».

### За здраду дзяржаве — выключная мера

Таксама дэпутаты прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці». Праектам закона прапануецца ўнясенне змяненняў у санкцыю часткі 2 артыкула 356 Крымінальнага кодэкса, якія прадугледжваюць магчымасць выключнай меры ў выглядзе смяротнага пакарання за здраду дзяржаве, учыненую службовай асобай, якая займае дзяржаўную пасаду, або асобай, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага. Прыводзяцца ў адпаведнасць таксама артыкулы 58 і 59 КК.

Артыкул 360 КК дапаўняецца заўвагай, якая дапускае вызваленне асобы ад крымінальнай адказнасці за падрыхтоўчыя дзеянні да дыверсіі ў выпадку яе прадухілення.

Таксама ў КК уносіцца дадатак у мэтах устанаўлення адказнасці за распаўсюджванне заведама лжывых звестак, якія дыскрэдытуюць Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні, ваенізаваныя арганізацыі Беларусі.

Акрамя таго, прапануецца ўстанавіць памер штрафу за антыдзяржаўныя злачынствы ў межах ад 500 да 50 тысяч базавых велічынь.

Праектам закона Крымінальны кодэкс дапаўняецца артыкулам 289-1 «Прапаганда тэрарызму». Таксама прапануецца дапоўніць КК артыкулам 375-2 «Парушэнне патрабаванняў па абароне дзяржаўных сакрэтаў».

Змяненні ў частку 4 артыкула 108 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, якія прапануецца праектам закона, прадугледжваюць магчымасць затрымліваць асоб па артыкулах 356-358-1 КК на тэрмін да 10 сутак, а абвінавачанне прад'яўляць у тэрмін да 20 сутак з моманту затрымання. Гэта выклікана тым, што часта па такіх саставах злачынстваў, акрамя працэсуальнага замацавання доказаў на пачатковай стадыі, актыўна праводзяцца аператыўна-следчыя камбінацыі, на правядзенне якіх 72 гадзін затрымання бывае недастаткова.

**Паводле БелТА.**